


# Гродзенскі ўніверсітэт

Выдаецца з 1986 года. Выходзіць адзін раз на месяц. Распаўсюджваецца бясплатна

№ 4 (344), 6 красавіка 2006 года, чацвер

ГАЗЕТА УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»


## Ганаровае званне

Доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару, загадчыку кафедры тэарэтычнай фізікі фізіка-тэхнічнага факультэта Валерыю Аляксандравічу Ліопе прысвоена званне «Ганаровы прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы».

Па склаўшайся ў ГрДУ традыцыі, гэтае ганаровае званне надаецца ў знак прызнання высокіх заслуг вучонага перад універсітэтам.

Віншуем Валерыя Аляксандравіча з заслужаным ганаровым званнем!

## ВІНШУЕМ ЮБІЛЯРАЎ

**Рэктарат, прафкам, Савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

❋4 красавіка — **Макараву Наталлю Сяргееўну**, лабаранта кафедры батанікі факультэта біялогіі і экалогіі.

❋7 кастрычніка — **Аніська Тамару Захараўну**, ветэрана працы.

❋10 красавіка — **Істоміну Чэславу Іосіфаўну**, старшага выкладчыка кафедры раманскіх моў аддзялення рамана-германскай філалогіі філалагічнага факультэта.

❋15 красавіка — **Стурэйка Клеменціну Канстанцінаўну**, вартаўніка аддзела вартаўнічай аховы гаспадарчага ўпраўлення.

❋16 красавіка — **Маляўко Пятра Іванавіча**, дацэнта кафедры беларускай літаратуры аддзялення беларускай і славянскай філалогіі філалагічнага факультэта.

❋17 красавіка — **Курыла-Савіцкага Рамана Антонавіча**, рабочага па абслугоўванню і рамонту будынкаў вучэбнага корпуса № 2.

❋28 красавіка — **Кавалёва Барыса Пятровіча**, загадчыка кафедры агульнай і сацыяльнай псіхалогіі факультэта псіхалогіі.



**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь** ***штогод прызначае персанальныя надбаўкі спецыялістам і кіраўнікам арганізацый адукацыі за выдатны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі. Надбаўкі выплачваюцца на працягу аднаго каляндарнага года.***

***Прыказам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь персанальныя надбаўкі за 2006 год ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы прызначаны дэкану гістарычнага факультэта доктару гістарычных навук, прафесару Аляксандру Мікалаевічу Нечухрыну і доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару кафедры тэорыі функцый, функцыянальнага аналізу, верагоднасцей і прыкладной матэматыкі факультэта матэматыкі і інфарматыкі Міхаілу Аляксеевічу Маталыцкаму.***

***Віншуем Аляксандра Мікалаевіча і Міхаіла Аляксеевіча і жадаем далейшых навуковых дасягненняў на карысць развіцця краіны!***

## ПАДАРУНКІ АД ГУБЕРНАТАРА

Сустрэча студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта са старшынёй Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта У.Я.Саўчанкам —добрая традыцыя апошніх год.

Вось і падчас апошняй такой сустрэчы студэнты ўсіх факультэтаў ГрДУ пачулі ад губернатара не толькі расказ аб дасягненнях ў эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці Гродзенскай вобласці за апошні год, але і адказы на свае шматлікія пытанні. А пытанняў было многа. Закраналі яны не толькі мэтавага размеркавання, ільгот пры атрыманні жылля для студэнтаў і студэнцкіх сем'яў, будаўніцтва інтэрнатаў для універсітэтаў горада, але і пытанні жыцця горада — развіцця транспартнай інфраструктуры і баз адпачынку, рэканструкцыі гістарычнага цэнтра Гродна і будаўніцтва новага маста праз Нёман.

І як заўсёды, адказы былі атрыманы на кожнае студэнцкае пытанне, у прыватнасці, на пытанні аб арганізацыі гарачага харчавання, раскладу заняткаў, паляпшэння здароўя студэнтаў, фарміравання аплаты за вучобу. На частку гэтых пытанняў адразу былі атрыманы канкрэтныя тлумачэнні, частку пытанняў рэктар ГрДУ Я.А.Роўба непасрэдна на сустрэчы адрасаваў для хуткага рэагавання адпаведным службам універсітэта.

З задавальненнем была ўспрынята інфармацыя аб тым, што кожны год у горадзе будзе з'яўляцца па аднаму інтэрнату для моладзі. У гэтым годзе такі падарунак атрымаюць навучэнцы музычнага вучылішча, на наступны — студэнты медыцынскага універсітэта. Чарговае наваселле студэнтаў-купалаўцаў прадугледжана ў 2007-2008 гадах. Але ўжо сёння будзе разглядацца пытанне аб поўнай перадачы гасцініцы «Гродна» універсітэту.

Не засталіся студэнты-купалаўцы без падарункаў ад губернатара. Камп'ютары для адной за лабараторый фізіка-тэхнічнага факультэта, касцюмы для мастацкага калектыву «Ясніца» і, галоўнае, разгляд пытання аб будаўніцтве сталовай у корпусе па вуліцы Даватара — такія канкрэтныя справы паабяцаў губернатар студэнтам ГрДУ. Да новага навучальнага года будзе адрамантаваны стадыён па вуліцы Захарава. Уладзімір Ягоравіч паабяцаў узяць пад кантроль і рамонт у інтэрнаце па вуліцы Пралетарскай.

(Працяг на 2-й старонцы).

**НА ЗДЫМКУ: фота на памяць. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама У.Я.Саўчанка і студэнты — Яўген Мікуліч, Іван Булгакаў, Яуген Жыдок і Эдуард Кароль. Фота Леаніда ШЧАГЛОВА.**

# ПАДАРУНКІ АД ГУБЕРНАТАРА

*(Працяг. Пачатак на 1-й старонцы).*

Для паляпшэння навучальнага працэсу губернатар паабяцаў студэнтам перавесці курсы аблвыканкама з будынка па вуліцы Леніна, 32 і перадаць універсітэту будынак Кастрычніцкага РАУС.

Цікавіла моладзь і перспектыва стварэння цэнтра адпачынку студэнтаў. Губернатар адказаў, што хоць сёння згодны перадаць кінатэатр «Космас» ці «Гродна» студэнцкай моладзі. Правесці рэканструкцыю за сродкі аблвыканкама, а ўтрыманне гэтых цэнтраў ўскласці на універсітэт.

Былі дадзены У.Я.Саўчанкам і даручэнні кіраўніцтву ГрДУ: разгледзець пытанне аб транспартным злучэнні новага інтэрната, у якім жывуць студэнты факультэта эканомікі і кіравання, з корпусам па вуліцы Горкага; аб выдзяленні пуцёвак для лячэння і адпачынку студэнтаў у прафілакторыі камбіната будаўнічых матэрыялаў і аб'яднання «Хімвалакно», аб кошце ксеракапіравання ў карпусах універсітэта, аб засяленні ў інтэрнаты студэнцкіх сем'яў.

На сустрэчы У.Я.Саўчанка ўрычыў пасведчанні стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Іх атрымалі Іван Булгакаў (факультэт матэматыкі і інфарматыкі) і Эдуард Кароль (юрыдычны факультэт). Студэнты факультэта матэматыкі і інфарматыкі Яўген Мікуліч і Яўген Жыдок былі адзначаны грашовымі прэміямі фонду як пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы.

Кіраўніцтва універсітэта ўважліва прааналізавала пытанні і прапановы студэнтаў, даручэнні старшыні Гродзенскага аблвыканкама У.Я.Саўчанкі і прыняло канкрэтныя меры па іх рэалізацыі. Між іншым, вырашаецца пытанне аб аздараўленні студэнтаў у прафілакторыях горада, падрыхтаваны прапановы па транспартнаму забеспячэння студэнтаў, хуткімі тэмпамі вядзецца рамонт інтэрната № 4. На працягу трох месяцаў будаўнічая арганізацыя завяршыць усе работы па рамонту другой яго часткі. Закуплена новае абсталяванне для трэнажорнага зала гэтага інтэрната.

Прыняты захады па зніжэнні кошту ксеракапіравання. З 20 да 10 працэнтаў зніжана рэнтабельнасць працы пунктаў ксеракапіравання, якія распалагаюцца ў карпусах універсітэта.

На пасяджэнні рэктарата 27 сакавіка разгледжана пытанне аб арганізацыі харчавання студэнтаў. Астатнія пытанні і даручэнні знаходзяцца ў працэсе вывучэння для іх далейшага вырашэння.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**

# В советах по защите диссертаций при ГрГУ им. Янки Купалы

Совет К 02.14.03. Иторические науки, философские науки, специальность «24.00.01 — теория и история культуры».

Председатель совета Ч.С.Кирвель, д. филос. н., проф.; учёный секретарь совета Г.Н.Щелбанина, к. филос. н., доц.

24 февраля 2006 года учёная степень кандидата философских наук присуждена Ольге Николаевне Иванчиной. Работа О.Н.Иванчиной выполнена в БГУ под научным руководством Н.А.Максимовой, кандидата философских наук, доцента.

**Н.М.НЕЧУХРИНА, методист высшей категории НИСа.**

# Результаты рейтинга кафедр

В Гродненском государственном университете имени Янки Купалы определен рейтинг кафедр по итогам работы за 2005 год.

По сравнению с прошлым годом, кафедры не просто «выстроились» в соответствии с показателями своей деятельности, но и были определены несколько номинаций, характеризующих успехи и достижения кафедр по определенным направлениям деятельности.

В номинации «Лидеры абсолютного рейтинга кафедр по результатам 2005 года» выделены четыре коллектива — кафедра истории Беларуси (заведующий кафедрой профессор И.П.Крень), кафедра спортивной медицины и лечебной физкультуры (зав. кафедрой доцент А.И.Шпаков), кафедра теории функций, функционального анализа, вероятностей и прикладной математики (зав. кафедрой профессор Е.А.Ровба), кафедра русского языка (зав. кафедрой профессор М.И.Конюшкевич).

В номинации «Лидер рейтинга кафедр по экономической эффективности» первенство у кафедры археологии и этнологии (зав. кафедрой доцент И.О.Федоров). Кафедра лазерной физики и спектроскопии (зав. кафедрой профессор С.С.Ануфрик) признана лучшей в номинации «Лидер рейтинга по индивидуальной эффективности кафедр в 2005 году».

Кафедры-лидеры в номинации «Значительное продвижение в развитии»: английской филологии (зав. кафедрой доцент О.Л.Малышева), теории и практики английского языка (зав. кафедрой доцент Л.М.Середа), экономики и управления на предприятии (зав. кафедрой доцент Ю.Э.Белых), информатики и вычислительной техники (зав. кафедрой доцент А.М.Кадан).

## *Подведены итоги конкурсов, проводившихся в Гродненском государственном университете среди кураторов и студентов, — на звание лучшего.*



Виталий ЛУКИН.

Победителем конкурса «Лучший заместитель декана факультета (заведующего отделением) по воспитательной и идеологической работе» в 2005 году стала заместитель декана по воспитательной и идеологической работе факультета экономики и управления Лариса Леонидовна Скворцова.

Победителем в номинации «Самый перспективный заместитель декана по воспитательной и идеологической работе» стал заместитель декана по воспитательной и идеологической работе факультета физической культуры Валерий Константинович Сухецкий.

«Самый организованный заместитель декана по воспитательной и идеологической работе» — этой номинации удостоена заместитель декана по воспитательной и идеологической работе юридического факультета Ирэна Юзефовна Кирвель.

В конкурсе «Лучший куратор года» принимали участие кураторы всех факультетов университета. Первое место присуждено кураторам педагогического факультета кандидату педагогических наук, доценту Марине Владимировне Салтыковой-Волкович и Елене Николаевне Авдеевич.

Чтобы стать лучшим студентом 2005 года, надо было проявить себя не только отличной учебой, но и активным участием в научной и общественной работе. Победителем конкурса «Студент 2005 года» Гродненского государственного университета стал Виталий Васильевич Лукин, пятикурсник факультета биологии и экологии.



Вероника ГРИШЕЛЬ.

В номинации «За патриотическое отношение к будущей профессии» конкурса «Студент года» отмечена студентка четвертого курса факультета экономики и управления Вероника Марьяновна Гришель.

**Е.С.ПОТЬКО,**
**заместитель начальника отдела воспитательной работы с молодежью и идеологической работы.**

Прызванне

# ВЫДАТНІК АДУКАЦЫІ

Гледзячы на гэтага жвавага, няўрымслівага чалавека не верыцца, што яго афіцыйнай, так бы мовіць, педагагічнай дзейнасці споўнілася паўстагоддзя! Так, менавіта з 16 лютага 1956 года Міхаіл Вікенцьевіч Васілючак стаў працаваць настаўнікам Карпавічскай школы Іўеўскага раёна. Мабыць, лёсам было наканавана маладому беларусу, выхадцу з простай сялянскай сям'і вёскі Малыя Князікоўцы, што на Іўеўшчыне, рашуча ступіць на педагагічны шлях. Малады педагог паступае ў Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага, паспяхова засвойвае курс навук і на размеркаванні выпуску дыпламаваных спецыялістаў просіцца на работу... ў вёску. Непераадольная цяга да ведаў, да навуковага пошуку прывяла маладога дырэктара Голдаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна ў аспірантуру роднай ВНУ.

Будучы аспірантам, Міхаіл Вікенцьевіч у маі 1969 года паспяхова абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Деятельность КП(б)Б по упрочению союза рабочего класса и крестьянства в западных областях Белоруссии в период социалистических преобразований (сентябрь 1939 — июнь 1941 гг.)». Пачынаецца новы перыяд жыццядзейнасці М.В.Васілючака. З чэрвеня 1969 года па студзень 1970 года ён з'яўляецца выкладчыкам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, затым працяглы час (люты 1970 — жнівень 1978 гадоў) выконвае абавязкі старшага выкладчыка, дацэнта Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

З верасня 1978 года вопытны гісторык-педагог — у складзе прафесарска-выкладчыцкага калектыву Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Прызначаецца прарэктарам па завочнаму (з 1980 года і вячэрняму) навучанню ГрДУ.

Навуковая дасціпнасць, грамадзянская пазіцыя М.В.Васілючака часцяком уступалі ў супярэчлівасць з вядомымі пастулатамі часу ў сэнсе ацэнкі гістарычных падзей і з'яў, іх падачы вучням і студэнтам. У прыватнасці, Міхаіл Вікенцьевіч успамінае выпадак, калі на ўроку па тэме асваення абложных зямель у сваім расказе прывёў прыклады безгаспадарчасці (5.000 га заставаліся неабмалочанымі пад снегам некалькі гадоў запар) мясцовых кіраўнікоў (ён быў жывым сведкам гэтага) і... заслужыў папрок «правяраючага» — «такія прыклады не садзейнічаюць выхаванню моладзі ў патрэбным накірунку». Але і ў далейшым сумленны педагог-гісторык не імкнуўся саступаць з пазіцый аб'ектыўнасці і гістарызма. Асноўная тэматыка яго навуковых публікацый: гісторыя заходніх абласцей Беларусі ў верасні-чэрвені 1939-1941 гг., а таксама гісторыя гарадоў і вёсак Гродзеншчыны. М. В. Васілючак з'яўляецца аўтарам шэрага навуковых і навукова-метадычных прац. Спецыялісты і аматары айчыннай гісторыі ведаюць манаграфію гродзенскага вучонага пад назвай «В семье единой». Мн., 1977.

Плённая педагагічная і навуковая дзейнасць М.В.Васілючака ўхвалена: ён узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», шматлікімі Граматамі Міністэрства асветы БССР, аблвыканкама, гарвыканкама, універсітэта, юбілейным медалём «60 лет Победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.».

За гады напружанай і крапатлівай працы Міхаілу Вікенцьевічу даводзілася выконваць шмат якіх «пачэсных», як у свой час гаварылі, абавязкаў «па лініі партыі» і дзяржавы. І ён, разумеючы, што даручэнні робяцца ўрэшце-рэшт дзеля паляпшэння справы і жыцця людзей, не ўхіляўся ад іх выканання з уласцівымі яму стараннасцю і спагадлівай дакладнасцю. І людская памяць аддзячвае чалавеку доўгу іабавязацельства.

М. В. Васілючак і сёння на строме жыцця. Ён больш дзесяці гадоў з'яўляецца нязменным старшынёй ветэранскай арганізацыі ГрДУ, членам Прэзідыума арганізацыі ветэранаў г. Гродна. Яго публікацыі можна сустрэць на старонках рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку. Як-ніяк, званне «выдатніка» дае імпульс, і не толькі. Міхаіл Вікенцьевіч словам і справай сцвярджае галоўную мэту, якой ён і прысвяціў свой шчодры талент педагога-выкладчыка — служыць людзям. Таму і заслужыў павагу ўсіх тых, хто жыве і працуе з ім побач.

Хочацца павіншаваць калегу з 50-годдзем плённага настаўніцтва, пажадаць даўгалецця, здзяйснення запаветнага. Так трымаць!

**У.Я.ЯГОРЫЧАЎ, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ, кандыдат гістарычных навук.**

Наука

# С именем ученого

Международная научная конференция «Актуальные проблемы мировой художественной культуры» собрала в Гродненском государственном университете имени Янки Купалы ученых из Беларуси, России, Украины, Польши, Литвы.

Прозвучавшие на пленарном заседании доклады высокого теоретического уровня задали тон активной работе в четырех секциях конференции: «Теоретические и методологические проблемы изучения мировой художественной культуры», «Музыка в контексте современной культуры», «Изобразительное искусство и проблемы современного культурного развития», «Вопросы методологии и методики музыкального образования».

Среди обсуждавшихся вопросов — тенденции развития эстетического образования в Беларуси, композиторское творчество и исполнительство, проблемы интерпретации, проблемы современного изобразительного искусства и дизайна как вида творческой деятельности, проблемы дилетантизма и профессионализма в искусстве, содержание музыкальных образовательных стандартов, необходимость развития редких направлений в эстетическом образовании.

Конференция с такой тематикой проводится в ГрГУ третий раз (периодичность — один раз в два года). Основателем ее по праву считается ученый-философ с мировым именем И.Д.Розенфельд. На заседании «круглого стола», где были подведены итоги научного форума, прозвучало предложение в знак уважения к памяти ученого придать конференции название «Актуальные проблемы мировой художественной культуры памяти профессора И.Д.Розенфельда».

**В.А.МИСТЮК, кандидат педагогических наук, доцент.**

# Совместные исследования

Заместитель директора по науке Института цитологии (г. Санкт-Петербург) Российской Академии наук доктор физико-математических наук К.К.Туроверов провел в Гродненском государственном университете семинар «Фолдинг белков» на кафедре общей физики.

Лаборатория структурной динамики, стабильности и фолдинга белков, которую возглавляет Константин Константинович в Институте цитологии, на протяжении 15 лет сотрудничает с белорусскими учеными из НАН Беларуси и Белгосуниверситета. Последние годы тесные научные связи установились с кафедрой общей физики ГрГУ, которую возглавляет кандидат физико-математических наук, доцент А.А.Маскевич. Исследования ученых направлены на изучение механизмов сворачивания белка в клетке в определенные структуры, нарушение которых приводит к возникновение опасных болезней, таких как болезни Альцгеймера, Паркинсона, коровьего бешенства.

На семинаре К.К.Туроверов показал важность процессов сворачивания и разворачивания белков для их функциональных свойств, рассказал об исследованиях структуры и свойств молекул.

Совместные усилия белорусских и российских ученых в данном направлении исследований позволяют решать биологические проблемы физическими методами. Как отмечал К.К.Туроверов, оборудование лаборатории кафедры общей физики ГрГУ позволяет проводить уникальные исследования, которые использованы при подготовке совместных статей в журнале «Прикладная спектроскопия». Разработки ученых получили поддержку Российского и Белорусского фондов фундаментальных исследований.

**Н.ВАШКЕЛЕВИЧ**

**14 марта 2006 года в Совете по защите диссертаций** Д 02.01.15 при Белорусском государственном университете аспиранткой кафедры теории функций, функционального анализа, вероятностей и прикладной математики ГрГУ имени Янки Купалы Татьяной Владимировной Русилко успешно защищена диссертация на тему «Асимптотический анализ сетевых вероятностных моделей процессов обработки исков и премий в страховых компаниях». Научный руководитель — доктор физико-математических наук, профессор Михаил Алексеевич Маталыцкий.

Диссертация представлена на соискание ученой степени кандидата физико-математических наук по специальности «05.13.18 — Математическое моделирование, численные методы и пакеты прикладных программ».

Диссертация защищена досрочно — за восемь месяцев до окончания аспирантуры. В списке научных работ диссертанта более 40 работ, в том числе: монография, написанная совместно с научным руководителем; 11 статей в научных рецензируемых журналах; 17 статей в сборниках материалов и сборниках статей научных конференций.

В соответствии с решением Совета университета о материальном поощрении научных руководителей и диссертантов М.А. Маталыцкий и Т.В.Русилко отмечены премиями в размере 15 и 14 базовых величин соответственно.

**Соб. инф.**

## Думкі аб выкладанні і выхаванні



*Павел Уладзіміравіч Сцяцко — вядомы беларускі навуковец і педагог, доктар філалагічных навук, прафесар. У 1949 годзе скончыў Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча і паступіў на факультэт мовы і літаратуры (беларускае аддзяленне) Гродзенскага педагагічнага інстытута. Закончыў яго ў 1953 годзе і з таго часу працуе выкладчыкам ВНУ: спачатку ў Гродзенскім падінстытуце, пасля ў Мінскім педінстытуце імя М.Горкага (1962-1981), Гомельскім універсітэце імя Ф.Скарыны (1981-1990), а з 1990 года — зноў у нашым універсітэце. З 1981 года па сённяшні дзень займае пасаду загадчыка кафедры (зараз — кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства аддзялення беларускай і славянскай філалогіі філалагічнага факультэта).*

*У 1962 годзе, пасля датэрміновага заканчэння аспірантуры Інстытута мовазнаўства АН БССР, П.У. Сцяцко абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1980 годзе ў АН БССР абараніў доктарскую дысертацыю «Субстантыўная дэрывацыя ў беларускай народна-дыялектнай мове». Вынікі яго даследаванняў апублікаваны ў шэрагу кніг і манаграфій, артыкулах у айчынных і замежных часопісах, навуковых зборніках, матэрыялах канферэнцый. Агульная колькасць публікацый перавышае 450.*

*П.У.Сцяцко кіруе знакамітай у рэспубліцы навуковай школай у галіне беларускага мовазнаўства. Сярод асноўных накірункаў яго даследаванняў — словаўтварэнне ў народна-дыялектнай і літаратурнай беларускай мове, фаналогія, лексікалогія, граматыка беларускай мовы, дыялекталогія, этымалогія, міжмоўныя кантакты, культура мовы і маўлення.*

*У розныя гады прафесар П.У. Сцяцко выкладаў курсы беларускай мовы, параўнальнай граматыкі беларускай, рускай і польскай моваў, спецкурс «Словаўтварэнне ў беларускай, польскай і рускай мовах» і іншыя. У цяперашні час выкладае «Уводзіны ў мовазнаўства», а таксама курс «Праблемы нармавання савецкага варыянта беларускай літаратурнай мовы». З'яўляецца аўтарам шматлікіх слоўнікаў, навучальных дапаможнікаў, падручнікаў, праграм, дыдактычных матэрыялаў для студэнтаў ВНУ.*

*П.У.Сцяцко ўзнагароджаны медалём імя Ф.Скарыны, з'яўляецца выдатнікам адукацыі. Ён — член Міжнароднага камітэта славістаў, Міжнароднага камітэта беларусістаў, Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь (старшыня яе Гарадзенскай філіі), рэдкалегій часопісаў «Роднае слова», «Веснік БДУ», «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы», «Гарадзенскія запісы (старонкі гісторыі і культуры)», «Беларуская мова: Энцыклапедыя», «Русский язык», «Białostocki Przegląd Kresowy», штотыднёвіка «Наша слова».*

*Павел Уладзіміравіч прыняў прапанову ўдзельнічаць у праекце «Педагогі Гродзенскага універсітэта» і згадзіўся адказаць на шэраг пытанняў.*

# П.У.Сцяцко: «Выкладчык універсітэта мусіць ведаць усё ці амаль усё па дысцыпліне, якую ён выкладае»

**- Шаноўны Павел Уладзіміравіч, як пачынаўся Ваш шлях да прафесіі педагога?**

- Да педагагічнай прафесіі далучыўся дзякуючы свайму старэйшаму брату Уладзіміру — настаўніку пачатковых класаў, які пасля вяртання з вайны ў 1946 годзе быў залічаны навучэнцам выпускнога курса Ваўкавыскага педвучылішча, а я, скончыўшы (на «выдатна») сямігодку, — на першы курс гэтай вучэльні. Разам са мною навучаліся людзі сталага веку, былыя франтавікі, якім нялёгка даваліся веды. Чуючы мае добрыя адказы на уроках, яны папрасілі мяне быць, кажучы сучаснай мовай, іх рэпетытарам — рыхтаваць да адказаў на ўроках. Я не мог адмовіць гэтым паважаным людзям. У далейшым такі занятак быў мне даспадобы, разам з тым ён патрабаваў ад «прафесара» (так называлі мяне мае аднакурснікі) надта сур'ёзнай, грунтоўнай падрыхтоўкі.

**- Ці адразу Вы аддалі перавагу прафесіі выкладчыка роднай мовы і літаратуры?**

- Лёгка даваліся мне ўсе навучальныя курсы. Любіў і захапляўся я і фізічна-матэматычнымі дысцыплінамі. Таму пасля сканчэння педвучылішча (на «выдатна») быў залічаны на фізічна-матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытута, але праз два месяцы пераве́ўся на філфак. Прыемна нагадаць, што аднакурснікам маім быў Пятрусь Макаль і на два гады раней за мяне скончыў філфак гэтай установы Аляксей Карпюк, знаныя ў далейшым пісьменнікі.

**- Як складвалася Ваша працоўная дзейнасць пасля заканчэння педінстытута?**

- Мяне, як выпускніка інстытута з дыпломам выдатніка, размеркавалі на працу выкладчыкам на кафедру беларускай мовы і літаратуры. Давялося самастойна распрацоўваць тэарэтычныя курсы, бо навучальных дапаможнікаў па беларускай мове тады не было. Усё гэта вымагала вялікіх высілкаў у галіне навуковай і навучальнай падрыхтоўкі. Да таго ж, штодзень даводзілася праводзіць 12-14 гадзін заняткаў (тры змены). Але захапленне навукай, апантанасць у ёй былі такія моцныя, што ўсё ўдавалася рабіць належным чынам.

Студэнты-філолагі і гісторыкі, якія слухалі мае лекцыі з курса «Уводзіны ў мовазнаўства», як здаецца, былі задаволеныя сваім выкладчыкам, хоць ён быў і маладзейшы гадамі за многіх тагачасных студэнтаў. Аўтарытэту маладых выкладчыкаў спрыяла і тое, што студэнты добра ведалі сваіх выкладчыкаў — былых персанальных стыпендыятаў інстытута (я атрымліваў такую стыпендыю).

**- Ці сустрэліся людзі, якія садзейнічалі фарміраванню Вашай прафесійнай пазіцыі, выпрацоўцы асабістых педагагічных установак?**

- Маладыя выкладчыкі з удзячнасцю пераймалі досвед старэйшых калегаў, былых сваіх настаўнікаў. Мы захапляліся лекцыямі такіх знакамітых на той час выкладчыкаў, як Пётр Іванавіч Кавалеўскі, які чытаў курс стараславянскай мовы, і Мікалай Рыгоравіч Працэнка — выкладчык замежнай літаратуры. Добрыя знаўцы сваіх прадметаў, людзі вельмі чулыя, таленавітыя, яны былі ўзорам падчас нашай працы ў інстытуце.

**- Якімі былі Вашы першыя сур'ёзныя навуковыя поспехі?**

- Лёс прывёў мяне ў Акадэмію навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства, яго аспірантуру. Да гэтага я ўжо здаў тут кандыдацкія экзамены па замежнай мове і сучаснай беларускай мове і тэорыі мовы. Старшыняваў тады на экзамене дырэктар Інстытута мовазнаўства АН Беларусі акадэмік К.Крапіва. Ацанілі мае веды на «выдатна» і запрасілі ў стацыянарную аспірантуру, якую я скончыў датэрмінова — за 10 дзён да канца другога года

аспірантуры абараніў кандыдацкую дысертацыю па народнай лексіцы Зэльвеншчыны. Апанентам па дысертацыі выступаў К.Крапіва, ужо віцэ-прэзідэнт Беларускай акадэміі навук.

**- Павел Уладзіміравіч, раскажыце, калі ласка, аб «мінскім перыядзе» Вашай працоўнай дзейнасці.**

- Пасля абароны дысертацыі мяне запрасіў на працу ў Мінскі педагагічны інстытут Ф.Янкоўскі, загадчык кафедры беларускай мовы, другі апанент па дысертацыі. Тут пачалося шырокае разгортванне маёй навуковай і навукова-метадычнай працы. Выходзіць з друку шэраг кніг па народнай беларускай мове: «Народная лексіка» (1970), «Дыялектны слоўнік» (1970), «Народная лексіка і словаўтварэнне» (1972), «Беларускае народнае словаўтварэнне» (1977), «Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы» (1969) — навучальны дапаможнік для філалагічных факультэтаў, напісаны разам з М.С.Яўневічам; «Беларуская мова» (1970) — навучальны дапаможнік для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, падрыхтаваны разам з М.Ц.Кавалёвай. У 1970-х гадах выйшлі з друку (напісаныя ў суаўтарстве) навучальныя дапаможнікі для студэнтаў-філолагаў «Сучасная беларуская мова. Марфалогія» (1975), «Сучасная беларуская літаратурная мова. Лексікалогія. Фразеалогія. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка і арфаграфія» (1976). У 1982 годзе быў выдадзены падручнік для навучэнцаў педвучылішчаў «Беларуская мова», у ім амаль трэцяя частка напісаная мною; у 2004 годзе пабачыла свет пятае выданне гэтае кнігі як падручніка для педагагічных каледжаў. Акрамя таго былі надрукаваныя «Зборнік дыктантаў для студэнтаў ВНУ» (1973, 1978), «Праграмы курса беларускай мовы для ВНУ» (1975, 1979), метадычны дапаможнік для студэнтаў «Аналіз слова, словазлучэння, сказа» (1977).

Апроч падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, шмат увагі надавалася мною навукова-даследчай працы — даследаванню беларускага словаўтварэння. Вынікам працы стала доктарская дысертацыя, абароненая ў 1980 годзе ў АН Беларусі.

**- Амаль 10 гадоў Вы працавалі ў Гомельскім універсітэце. Што б Вы выдзелілі, расказваючы аб гэтым этапе свайго жыцця?**

- 3 ліпеня 1981 года я стаў працаваць загадчыкам кафедры агульнага, славянскага і рускага мовазнаўства Гомельскага універсітэта імя Францыска Скарыны, чытаў курс «Уводзіны ў мовазнаўства», спецкурс параўнальнай граматыкі беларускай і рускай моваў, вёў навуковую працу ў галіне ўсходнеславянскай лінгвістычнай тэрміналогіі. Здабыткі навуковай працы ўвасобіліся ў трох кнігах (напісаных у суаўтарстве): «Лингвистическая терминология в вузовских курсах» (1984), «Русско-белорусский словарь лингвистических терминов» (1988), «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў» (1990, аўтары П.У.Сцяцко, М.Ф.Гуліцкі, Л.А.Антанюк).

Падчас працы ў Гомельскім універсітэце прымаў удзел у IX Міжнародным з'ездзе славістаў (апублікаваны тэксты двух выступаў). Падвышаў свой славістычны досвед у Карлавым універсітэце ў Празе (1983) і Варшаўскім універсітэце (1988).

